www.baj.by

Беларуская асацыяцыя журналістаў

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ

# СМІ Ў БЕЛАРУСІ

№2 (68),
травень–ліпень
2022



unesco

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ
СМІ Ў БЕЛАРУСІ
№3 (69), травень-ліпень 2022

# ЗМЕСТ:

Кантэкст ........................................ 3

Крымінальны пераслед журналістаў .................................. 4

Перашкода дзейнасці журналістаў і медыяў........................... 9

Застасаванне антыэкстрэмісцкага заканадаўства ............. 11

Падзеі ў дзяржаўным медыясектары ................................ 13

Працягваўся пераслед журналістаў, уключна з прыцягненнем да крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці, абмежаванне доступу да кантэнту незалежных СМІ, затрыманні і вобшукі.

У апублікаваным да Сусветнага дня свабоды прэсы «Індэксе свабоды прэсы 2022» Беларусь заняла 153-е месца з 180[1]. Гэта найгоршы паказчык сярод дзяржаваў, якія знаходзяцца ў Еўропе.




3 траўня ў Монтавідэа адбылася цырымонія ўзнагароджання Беларускай асацыяцыі журналістаў Сусветнай прэміяй ЮНЭСКА/Гільерма Кана за ўнёсак у свабоду прэсы. Узнагароду атрымаў старшыня БАЖ Андрэй Бастунец, які ў сваёй прамове адзначыў: «Гэтую прэмію БАЖ расцэньвае як падтрымку ўсёй незалежнай журналісцкай супольнасці Беларусі. І спадзяецца, што яна зможа прыцягнуць увагу да далейшага пагаршэння становішча са свабодай СМІ ў краіне,

[1] https://rsf.org/en/index

паўплывае на змену гэтага становішча да лепшага, на лёс тых журналістаў, якія цяпер у Беларусі знаходзяцца за кратамі»[2].

Апроч прэміі ЮНЭСКА, БАЖ у той самы дзень былі ўручаныя Ганаровае званне за свабоду выказвання ў Дзень разнастайнасці (Difference Day Honorary Title for Freedom of Expression), якое прысуджаецца двума ўніверсітэтамі Бруселя (ULB і VUB), а таксама прэмія «Свабода прэсы 2022» шведскай секцыі арганізацыі «Рэпарцёры без межаў» (RSF)[3].

# Крымінальны пераслед журналістаў

На канец ліпеня 2022 года 29 беларускіх журналістаў знаходзіліся ў зняволенні. Восем з іх адбывалі пакаранне па судовых прысудах па крымінальных справах, астатнія – у сувязі з крымінальным пераследам.

6 чэрвеня Мінскі абласны суд пачаў на закрытым паседжанні разглядаць «справу БелаПАН», па якой абвінавачанымі праходзяць Дзмітрый Наважылаў, Ірына

---

2 https://baj.by/ru/content/sostoyalas-ceremoniya-vrucheniya-bazh-vsemirnoy-premii-yunesko-gilermo-kano-za-vklad-v

3 https://baj.by/be/content/belaruskaya-asacyyacyya-zhurnalistau-stala-laureatam-difference-day-honorary-title-u-bruseli
https://baj.by/ru/content/bazh-nagrazhden-premiey-svoboda-pressy-2022-ot-shvedskoy-organizacii-reportery-bez-granic

Леўшына, Андрэй Аляксандраў і Ірына Злобіна. Аднак 29 чэрвеня ён быў прыпынены мінімум на два месяцы[4].

8 чэрвеня журналіст «Радыё Свабода» Андрэй Кузнечык быў прысуджаны па частцы 1 артыкула 361-1 Крымінальнага кодэкса (стварэнне экстрэмісцкага фарміравання або ўдзел у ім) да 6 год пазбаўлення волі ў калоніі строгага рэжыму. Суд праходзіў у закрытым рэжыме, таму канкрэтныя абставіны справы невядомыя[5].




Сталася вядомым, што рэдактару «Штодзённіка» Сяргею Сацуку, затрыманаму 8 снежня 2021 года, у якога скончаўся максімальна магчымы тэрмін утрымання пад вартай, прад'явілі абвінавачанне яшчэ паводле двух артыкулаў Крымінальнага кодэкса ў дадатак да абвінавачання ў атрыманні хабару: артыкул 130 (распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варажнечы ці разладу) і артыкул 426 (перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў). Якія менавіта дзеянні звязваюцца з новымі абвінавачаннямі, невядома[6].

15 чэрвеня быў абвешчаны прысуд галоўнаму рэдактару газеты «Новы Час» Аксане Колб. Яна атрымала 2,5 года абмежавання волі з накіраваннем у выпраўленчую ўстанову адкрытага тыпу праз вынесенае абвінавачанне паводле часткі 1 артыкула 342 Крымінальнага кодэкса (арганізацыя і

[4] https://t.me/pozirkonline

[5] https://baj.by/be/content/frylansera-svabody-andreya-kuznechyka-asudzili-na-shesc-gadou-turmy

[6] https://baj.by/be/content/znyavolenamu-redaktaru-syargeyu-sacuku-vystavili-abvinavachanni-pa-novyh-artykulah



падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх). Пазней яна пакінула Беларусь[7].

23 чэрвеня ў Гомельскім абласным судзе пачаўся працэс над намеснікам старшыні БАЖ, журналісткай польскага тэлебачання (TVP) Ірынай Слаўнікавай, які з перапынкам працягваўся да 3 жніўня. Яе прысудзілі да пяці год пазбаўлення волі паводле двух крымінальных артыкулаў: 342 (арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх) і 361 (стварэнне экстрэмісцкага фарміравання або кіраванне такім фарміраваннем або структурным падраздзяленнем у яго складзе)[8].

[7] https://baj.by/ru/content/oksane-kolb-dali-25-goda-himii-i-osvobodili-v-zale-suda

[8] https://baj.by/be/content/iryne-slaunikavay-pryznachyli-5-gadou-znyavolennya

7 ліпеня ў суд была накіраваная крымінальная справа былой журналісткі дзяржаўнага тэлебачання Ксеніі Луцкінай, якая знаходзіцца пад вартай са снежня 2020 года. Яна абвінавачваецца ў змове з мэтай захопу дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам (артыкул 357 Крымінальнага кодэкса), бо, маўляў, «ачоліла групу інфармацыйнага забеспячэння і процідзеяння дзяржаўным СМІ» ў Каардынацыйнай радзе беларускай апазіцыі, а таксама спрабавала стварыць грамадскае беларускае інтэрактыўнае тэлебачанне для «хавання і скажэння рэальных фактаў, эскалацыі пратэставай актыўнасці, стымулявання расколу ў беларускім грамадстве, фарміравання ў людзей адмоўнага меркавання пра дзейнасць дзяржорганаў». Луцкінай пагражае пакаранне ад васьмі да дванаццаці год пазбаўлення волі[9].

13 ліпеня ў Гомельскім абласным судзе ў закрытым рэжыме быў абвешчаны другі прысуд журналістцы Кацярыне Андрэевай. Яе прызналі вінаватай у «здрадзе дзяржаве» (частка 1 артыкула 356 Крымінальнага кодэкса) і прызначылі пакаранне ў выглядзе васьмі год пазбаўлення волі. Раней, у лютым 2021 года, яна была прысуджаная да двух год калоніі; за пяць месяцаў да выхаду з калоніі ёй прад'явілі новае абвінавачанне[10].

У траўні–ліпені 2022 года быў распачаты шэраг новых крымінальных спраў супраць журналістаў.

5 траўня быў затрыманы карэспандэнт баранавіцкага выдання «Intex-press» Юрый Ганцарэвіч. Затым супраць яго ўзбудзілі крымінальную справу паводле артыкула аб садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці (артыкул 361-4) у сувязі з перасылкай фота расійскай вайсковай тэхнікі

[9] https://baj.by/ru/content/v-sud-napravili-delo-eks-zhurnalistki-bt-ksenii-luckinoy-po-obvineniyu-v-zagovore-s-celyu

[10] https://baj.by/ru/content/otbyvayushchey-nakazanie-zhurnalistke-katerine-andreevoy-vynesli-eshche-odin-prigovor-za

выданням «Зеркало» і «Радыё Свабода». 14 ліпеня ён быў прысуджаны да 2 год і 6 месяцаў пазбаўлення волі[11].

Раніцай 18 траўня супрацоўнікі КДБ затрымалі дырэктара газеты «Беларусы і рынак» Канстанціна Залатых. Яму было прад'яўленае абвінавачанне паводле часткі 2 артыкула 130 Крымінальнага кодэкса Беларусі (распальванне варажнечы або разладу, спалучаныя з гвалтам або здзейсненыя пасадовай асобай), які прадугледжвае пакаранне ад 3 да 10 год пазбаўлення волі. У цяперашні час Канстанцін Залатых знаходзіцца пад вартай[12].

26 траўня адбыўся вобшук у доме журналіста Алеся Любенчука ў вёсцы Крывічы Іўеўскага раёна, пасля якога ён быў затрыманы ў межах крымінальнай справы і дастаўлены ў ізалятар часовага ўтрымання ў Мінску.

Вядома, што журналісту прад'яўленыя абвінавачанні, але крымінальны артыкул, які інкрымінуецца Любенчуку, дакладна невядомы (адвакат знаходзіцца пад падпіскай аб неразгалошванні). Раней Любянчук супрацоўнічаў з тэлеканалам «Белсат»[13].

17 чэрвеня ў адносінах галоўнага рэдактара сайта ABW.by Юрыя Гладчука і рэдактара спецпраектаў Юліі Мудрэўскай былі ўзбуджаныя крымінальныя справы паводле артыкула 342 Крымінальнага кодэкса (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх). Яны абое знаходзяцца пад вартай[14].

Дырэктар «Дзеў Бай Медыя» Віталь Андрас і яго жонка Алена Андрас, якая працавала бухгалтарам прадпрыемства, былі затрыманыя 23 чэрвеня. Праўладныя Telegram-каналы паведамілі,

---

[11] https://www.intex-press.by/2022/07/14/vynesen-prigovor-zhurnalistu-intex-press/

[12] https://mediazona.by/news/2022/05/18/bir

[13] https://mediazona.by/news/2022/05/26/lub

[14] https://reform.news/317779-na-zhurnalistov-abw-by-zaveli-ugolovnye-dela

што супраць Віталя ўзбуджана крымінальная справа за тое, што ён нібыта «падбухторваў людзей на дзяржпераварот» і рэпосціў NEXTA. Пасля вобшуку і затрымання Віталь і Алена былі вызваленыя[15].



Галоўнае ўпраўленне па расследаванні злачынстваў у сферы арганізаванай злачыннасці і карупцыі (ГУБАЗіК) узбудзіла, у дадатак да абвінавачання па дзесяці артыкулах, новую крымінальную справу па артыкуле 290-5 Крымінальнага кодэкса (арганізацыя дзейнасці тэрарыстычнай арганізацыі і ўдзел у дзейнасці такой арганізацыі) у адносінах Сцяпана Пуцілы і іншых асобаў за арганізацыю і кіраванне дзейнасцю Telegram-канала Nexta, які быў прызнаны тэрарыстычнай арганізацыяй рашэннем Вярхоўнага суда. Санкцыя паводле гэтага артыкула прадугледжвае пазбаўленне волі на тэрмін да 15 год[16].

# Перашкода дзейнасці журналістаў і медыяў

На працягу траўня–ліпеня 2022 года БАЖ было зафіксавана 15 затрыманняў медыяработнікаў і 15 вобшукаў. Пяць журналістаў былі прысуджаныя да адміністрацыйнага арышту на тэрмін ад 10 да 15 содняў.

[15] https://baj.by/be/content/protiv-direktora-devby-vozbudili-ugolovnoe-delo

[16] https://baj.by/be/content/na-scyapana-pucilu-i-yana-rudzika-zavedzenaya-kryminalnaya-sprava-za-terarystychnuyu

Так, у Гомелі 27 чэрвеня быў затрыманы і прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці фатограф-фрылансер Сяргей Лысенка, які знаходзіўся ў парку, дзе адбывалася свята для ўкраінскіх дзяцей[17].




У ліпені быў заблакаваны доступ з Беларусі да сайта беларускага незалежнага часопіса «ARCHE»[18].

15 траўня сайт The Village Беларусь быў унесены ў рэестр забароненых у Расіі ды заблакаваны для расійскіх карыстальнікаў. Яго рэдакцыя атрымала ліст ад Раскамнагляду з патрабаваннем выдаліць тэкст «Што не так з афіцыйнай расійскай версіяй абстрэлу вакзала ў Краматорску, дзе загінулі 50 чалавек», але адмовілася гэта зрабіць[19].

---

[17] https://baj.by/be/analytics/represii-suprac-zhurnalistau-u-2022-godze-tablica-spis-znyavolenyh

[18] https://baj.by/be/content/mininfarm-zablyakavau-sayt-belaruskaga-nezalezhnaga-chasopisu-arche

[19] https://www.the-village.me/village/city/news-city/292203-blokirovka

Таксама ў Расіі была выдадзеная судовая пастанова аб забароне распаўсюду інфармацыі пра страты расійскай арміі падчас вайны ва Украіне, размешчанай на сайце газеты «Беларусы і рынак». Пад забарону патрапіў ужо выдалены на той момант матэрыял[20].

# Застасаванне антыэкстрэмісцкага заканадаўства

Кантэнт незалежных СМІ прызнаваўся экстрэмісцкімі матэрыяламі. Асабліва часта гэта адбывалася у дачыненні да іх старонак у сацсетках (у тым ліку тых выданняў, чые сайты былі заблакаваныя раней). Гэта закранула сайт і сацыяльныя сеткі выданняў «Медыязона. Беларусь», «Медыя-Палессе», «Мост», Telegram-канал «Брэсцкай газеты», «Hrodna.Life», а таксама канал самвыдату «ByProsvet». Таксама «экстрэмісцкім» быў прызнаныTelegram-канал «HARBACEVIČ» журналіста «Нашай Нівы» Арцёма Гарбацэвіча і папулярны YouTube-канал «Жыццё-маліна», дзе публікуюцца інтэрв'ю з прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці.

Два незалежныя медыя – KYKY.ORG і «Еўрарадыё» – паводле рашэння МУС былі ўключаныя ў Пералік арганізацыяў, фарміраванняў, індывідуальных прадпрымальнікаў і грамадзянаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці, як «экстрэмісцкія фарміраванні». Таксама туды патрапіла нефармальнае друкаванае

[20] https://baj.by/ru/content/v-rossii-zapretili-dostup-k-saytu-gazety-belorusy-i-rynok



выданне «Честная газета» (а таксама звязаныя з ім сацсеткі і Telegram-бот), асобнікі якога былі сканфіскаваныя ў распаўсюдніка Алега Гаўрылава напрыканцы 2021 года. Па выніках экспертызы тэкстаў газеты яму было прад’яўленае абвінавачанне паводле чатырох артыкулаў Крымінальнага кодэкса: 361 (заклікі да дзеянняў, скіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь), 341 (апаганьванне пабудоў і псаванне маёмасці), 130 (распальванне варажнечы або разладу) і 367 (паклёп у дачыненні да прэзідэнта Рэспублікі Беларусь).

Блогер і супрацоўнік «Радыё Свабода» Ігар Лосік, прысуджаны да 15 год пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму, быў уключаны КДБ у Пералік арганізацыяў і фізічных асобаў, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці.

14 чэрвеня Вярхоўны суд прызнаў таварыства з абмежаванай адказнасцю «ТУТ БАЙ МЕДЫЯ» «экстрэмісцкай арганізацыяй». У сувязі з гэтым экс-міністр інфармацыі Ігар Луцкі заявіў: «Было наўпроставае пасягальніцтва на суверэнітэт і незалежнасць нашай краіны, фінансаванне гэтых СМІ, недзяржаўных, ажыццяўлялася звонку і каардынавалася таксама звонку. Яскравы прыклад гэтаму – цяперашняе рашэнне па TUT.BY. Яго прызналі экстрэмісцкім!»[21]

[21] https://baj.by/be/content/eks-glava-mininforma-prokommentiroval-priznanie-tutby-ekstremistskoy-organizaciey

# Падзеі ў дзяржаўным медыясектары

У чэрвені кампанія Globecast прыняла рашэнне пра адключэнне тэлеканалу «Беларусь-24» ад спадарожнікавага вяшчання на шэраг краінаў еўрапейскага і ціхаакіянскага рэгіёну. Гэта выклікала абурэнне Міністэрства інфармацыі Беларусі[22].

Гэткую ж рэакцыю выклікала рашэннеTelegram цалкам выдаліць адыёзныя праўладныя каналы «Желтые сливы» і «Ваши сливы», якія друкавалі «пакаяльныя» відэа затрыманых і абразы на адрас апанентаў улады[23].

Звяз еўрапейскіх і футбольных асацыяцыяў (УЕФА) выключыў Белтэлерадыёкампанію са спісу афіцыйных вяшчальнікаў Лігі Нацыяў. У выніку гэтага матчы футбольнай зборнай краіны больш нельга паглядзець па тэлебачанні ў Беларусі (раней іх паказваў тэлеканал «Беларусь 5»)[24].

[22] https://baj.by/be/content/mininform-razbushevalsya-chem-vozmushcheno-vedomstvo

[23] https://baj.by/be/content/telegram-calkam-vydaliu-prauladnyya-kanaly-zhoutyya-zlivy-i-vashy-zlivy

[24] https://baj.by/be/content/uefa-isklyuchil-bt-iz-spiska-veshchateley-ligi-naciy

**«БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»**

www.baj.by

Змест гэтага электроннага выдання абаронены нормамі Аўтарскага права.
Спасылка на «Беларуская асацыяцыя журналістаў» пры выкарыстанні матэрыялаў ЭЛЕКТРОННАГА БЮЛЕТЭНЯ «СМІ Ў БЕЛАРУСІ» з'яўляецца абавязковай.

Кантакт:
Бастунец Андрэй Леанідавіч

E-mail: press@baj.by
Web: www.baj.by

2022